ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№1 (1054) | ЧАЦВЕР, 15 студзеня 2004 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ НАШАЙ КРАІНЫ

30 снежня 2003 г. ва універсітэце адбылася абласная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 85-годдзю ўтварэння БССР, на якую было прадстаўлена 10 дакладаў. Яе адкрыў прарэктар па навуковай рабоце, доктар тэхнічных навук, прафесар Дзмітрый Рыгоравіч Лін.

З прывітальнымі словамі да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся начальнік упраўлення інфармацыі і друку Гомельскага аблвыканкама Яўген Генадзьевіч Міткевіч.

З вялікай цікавасцю быў заслуханы даклад пасла па асобых даручэннях Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь Мікалая Рыгоравіча Вайцянкова "Перспектывы саюза Беларусі і Расіі".

Са змястоўнымі паведамленнямі выступілі дэкан гістарычнага факультэта к.г.н., дацэнт М.І. Старавойтаў – "Абвяшчэнне БССР: старонкі гісторыі"; к.г.н., дацэнт А.І. Зелянкова – "Нацыянальная культурная палітыка ў БССР"; загадчык кафедры палітычнай сацыялогіі, к.сац.н., дацэнт А.Я. Рычкоў – "Беларуская дзяржаўнасць як нацыянальная ідэя"; аўтар гэтых радкоў – з дакладам "Канстытуцыйнае будаўніцтва ў БССР".

На канферэнцыю былі прадстаўлены паведамленні "Сацыяльна-дэмаграфічныя праблемы Гомельшчыны і Беларусі" д.т.н., прафесара Д.Р. Ліна; "Канстытуцыйныя асновы сацыяльнай дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь" к.г.н., дацэнта І.І. Эсмантовіч; "Аб развіцці прыгранічнага супрацоўніцтва Гомельскай вобласці" к.э.н., дацэнта Т.В. Карпей; "Аб развіцці малога і сярэдняга бізнесу ў Рэспубліцы Беларусь" к.э.н., асістэнта В.С. Башлаковай; "Аб прыцягванні студэнцкай моладзі да даследаванняў у галіне грамадскіх навук" ст. выкладчыка А.В. Гаева.

Канферэнцыя была арганізавана пры ўдзеле Гомельскага аблвыканкама і абласной грамадскай арганізацыі таварыства "Веды".

Прафесар Д.Р. Лін выказаў падзяку дакладчыкам і прысутным за актыўны ўдзел у рабоце канферэнцыі і выказаў упэўненасць у тым, што правядзенне такіх мерапрыемстваў стане добрай традыцыяй.

**І. ЭСМАНТОВІЧ,**
**к.г.н., дацэнт,**
**старшыня пярвічнай арганізацыі таварыства "Веды" ГДУ.**

Імі ганарыцца універсітэт

## АДЧУВАЦЬ СЯБЕ ПАТРЭБНАЙ

*Ірыне Логвінавай, студэнтцы 5 курса факультэта замежных моў, двойчы аказваецца вялікі гонар: ёй прызначаецца стыпендыя спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных студэнтаў.*

*За плячамі ў гэтай студэнткі, абаяльнай дзяўчыны, шмат дасягненняў.*

**– Іра, чаму ты вырашыла займацца замежнай мовай?**

– Гэта быў усвядомлены выбар. Яшчэ калі з'яўлялася вучаніцай школы №10 г. Гомеля, перамагла ў міжнародным конкурсе, які праводзіўся арганізацыяй "Accels." У выніку паехала вучыцца ў ЗША на год. Калі вярнулася, напісала работу "Гістарычнае развіццё сістэмы адукацыі ЗША і Беларусі". Гэта было маё першае даследаванне. Потым удзельнічала ў алімпіядах па англійскай мове. Калі заняла 2-е месца ў абласной алімпіядзе, была залічана ў ГДУ без экзаменаў.

**– Якія мовы, акрамя англійскай, ты ведаеш?**

– Французскую. Я атрымліваю другую адукацыю ў Франка-беларускім інстытуце кіравання, праходзіла стажыроўку ў Францыі. Таксама вывучаю нямецкую мову.

**– Раскажы аб сваёй навуковай дзейнасці.**

– Пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы Галіны Мікалаеўны Ігнацюк займалася змяненнем значэння слоў, відамі семантык. Зацікавіў мяне таксама "Псіхааналітычны падыход да аналізу літаратурнага твора". Гэта даследаванне вядзецца на стыку псіхалогіі і лінгвістыкі. Думаю, што гэта і будзе тэмай дыпломнай работы. Маім навуковым кіраўніком з'яўляецца к.пед.н., дацэнт кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы Ірына Кірылаўна Жыліна.

**– Чым займаешся ў вольны час?**

– Слухаю альтэрнатыўную музыку, рускі рок, шмат чытаю.

**– А грамадскай дзейнасці ўдзяляеш увагу?**

– Імкнуся быць карысной людзям. У 2002 годзе ў рамках акцыі "Дзецям Чарнобыля" вяла ў Будa-Кашалёве гурток па англійскай мове для дзяцей 7-11 класаў. У сельскіх школах шмат адораных вучняў і, на жаль, яны не заўсёды маюць магчымасць рэалізавацца.

**– Ірына, якія ў цябе планы на будучае?**

– Увогуле, хачу выкладаць англійскую мову, таму што выкладанне – гэта стваральная дзейнасць. Вельмі важна адчуваць сябе патрэбнай.



Гутарыла Тацццяна ЦЕЛЯХОВІЧ.
На здымку: Ірына Логвінава.
Фота У. ЧЫСЦІКА.

Дзённік сесіі

## ВЕДЫ ПЕРШАКУРСНІКАЎ АЦЭНЬВАЮЦЦА ПА НОВАЙ ШКАЛЕ

***Вось і пачалося... У каго пара халодная, з маразамі, а ў каго – нават вельмі гарачая. Зразумела, размова ідзе аб зімовай экзаменацыйнай сесіі, адказным і творчым перыядзе ў жыцці студэнтаў. Каму пашчасціла, па аднаму – два экзамены ўжо здалі. Такіх большасць. Хто стартаваў няўдала, мае шанс выправіцца.***



*Першакурсніца факультэта замежных моў Алена Ярмоленка атрымала на экзамене па англійскай мове 9 балаў.*

У многіх факультэтаў – прыкладна аднолькавы тэрмін здачы экзаменаў: з 5 па 24 студзеня. А гэтаму папярэднічалі залікі. Для некаторых студэнтаў яны аказаліся непераадольным бар'ерам, як, напрыклад, гэта здарылася з асобнымі першакурснікамі спецыяльнасці "Гісторыя і англійская мова", будучымі географамі, эколагамі, псіхолагамі. Сталася так з-за іх шматлікіх пропускаў заняткаў. Давялося кіраўніцтву факультэтаў нават паведамляць бацькам такіх прагульшчыкаў аб недысцыплінаванасці іх дзяцей.

Не ўсе студэнты, пераведзеныя працягваць вучобу ў ГДУ з іншых ВНУ, змаглі своечасова, да пачатку сесіі, ліквідаваць розніцу ў вучэбных планах.

Экзамены для пяцікурснікаў спецыяльнасці "Геалогія і разведка месцанараджэнняў карысных выкапняў" – ужо пройдзены этап, за выключэннем пяці двоечнікаў. Будучыя юрысты вытрымалі выпрабаванні на веды і з 1 снежня мінулага года праходзяць практыку. Студэнты выпускнога курса эканамічнага факультэта, у якіх экзаменацыйная пара таксама завершана, паспелі адпачыць на канікулах і пачалі замацоўваць веды на вытворчасці. Яны, як паведаміла дэкан факультэта Т.В. Карпей, праходзяць практыку ў г. Гомелі і па вобласці, у іншых рэгіёнах Беларусі. Сёлета ўпершыню адбудзецца выпуск па спецыяльнасці "Сусветная эканоміка", і адна са студэнтак гэтай спецыяльнасці Аксана Разаева праходзіць практыку ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. 14 студэнтаў III-V курсаў, што навучаюцца паралельна на эканамічным факультэце і ў Франка-Беларускім інстытуце кіравання, здалі сесію датэрмінова і паехалі на 4-х месячную практыку ў Францыю.

Галоўнай адметнасцю сёлетняй зімовай экзаменацыйнай сесіі стала новаўвядзенне Міністэрства адукацыі рэспублікі: ацэнка ўзроўню ведаў, практычных уменняў і навыкаў студэнтаў І-га курса па 10-бальнай шкале. Згодна ёй мінімальна неабходнай адзнакай для прадаўжэння вучобы з'яўляецца 4 (чатыры). Адзнакі 1,2,3 з'яўляюцца нездавальняючымі і ў залікоўку не ставяцца. Гэта, зразумела, прымушае выкладчыкаў больш уважліва, узважана, аб'ектыўна ацэньваць адказы студэнтаў, каб выдатнікі, тыя, хто займаліся на "4" і "5", атрымлівалі па выніках папярэдняй сесіі павышаную стыпендыю, не перайшлі цяпер у разрад ніжэйшы і не пацярпелі матэрыяльна.

Застаецца пажадаць усім студэнтам поспехаў, цярплівасці і добрых адзнак.

(Наш кар.)



*Адны пяцёркі! Іх атрымалі на экзамене па медыцынскай псіхалогіі трэцякурсніцы факультэта псіхалогіі і даўузаўскай падрыхтоўкі Тацццяна Суворава, Арына Губанава, Яўгенія Быкоўская, Алена Гавароўская.*

*Фота У. ЧЫСЦІКА.*

## ЗДОРОВЫЙ ОБРАЗ ЖИЗНИ – СОСТАВНАЯ ЧАСТЬ НАЦИОНАЛЬНОЙ ИДЕИ

**В конце декабря 2003г. в г.Минске состоялась научно-практическая конференция «Духовно-нравственное и физическое оздоровление общества: состояние, проблемы, поиск эффективных форм и методов» и IV Пленум Правления общественного объединения «Белорусское общество «Знание».**

Конференция, продолжающая традиции идеологической работы общества «Знание», свидетельствует об актуальности теоретических и практических поисков более конструктивного и эффективного использования научно-просветительского и воспитательного потенциала общества «Знание» в данном направлении.

В ходе обсуждения докладов и сообщений участники конференции пришли к выводу о том, что проблемы оздоровления общества должны стать объектом постоянного анализа работниками просвещения. Духовно-нравственное оздоровление белорусского общества предполагает всемирное развитие национальных духовных процессов нашей страны, поэтому в числе приоритетных задач, стоящих перед учеными и лекторами общества «Знание», важнейшей является пропаганда здорового образа жизни, тесно связанная с учебно-познавательными, досуговыми и другими сферами бытия людей.

Перед участниками конференции с докладом выступил зам. Главы Администрации Президента Республики Беларусь О.В. Пролесковский, который всесторонне проанализировал современное состояние идеологической работы, рассказал об особенностях духовно-нравственного формирования студенческой молодежи в БРСМ, отметил важность процесса возрождения общественных организаций «Знание».

Особенно интересным для работников вузов было выступление И.В.Котлярова, председателя Постоянной комиссии по образованию, культуре, науке и научно-техническому прогрессу Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь. Он отметил, что наша республика отличается самым высоким на постсоветском пространстве качеством образования, но поскольку идеологию формировать могут только высокообразованные профессионалы, следует решить еще многие важные задачи. Профессор И.В.Котляров сообщил, что возглавляемая им комиссия обсуждает законопроект о высшей школе, в котором найдут отражение вопросы нормального финансирования профессорско-преподавательского состава вузов, аудиторной наполняемости на практических занятиях, функции ВАКа планируется усилить, чтобы в науке были только достойные, резко уменьшится количество советов по защите диссертаций. Изменения коснутся и многих других сфер науки и образования. Будет принят новый закон о культуре, в частности, о национальном кинематографе, который непременно внесет свою лепту в формирование национальной идеологии.

«Идеология – это духовный реактор, который дает новые идеи, создает ценности», – отметил академик НАНБ Е.М.Бабосов. Зам. министра образования республики Т.В.Ковалева рассказала о факторах успешности формирования духовно-нравственного и физического мира учащейся молодежи на трех основных уровнях (институтах) социализации общества: в семье, церкви и в системе образования в целом.

В работе конференции приняли участие и.о. ректора ГГУ, профессор, председатель областной организации общества "Знание" С.Ф. Каморников, председатель первичной организации общества "Знание" нашего университета доцент И.Ф. Эсмантович, зав. кафедрой политической социологии доцент А.Е. Рычков, автор этих строк.

Обсуждение многих вопросов, связанных с обществом «Знание», было продолжено на Пленуме. Его участники заявили о готовности своих организаций к более широкому и тесному сотрудничеству с органами государственной власти в реализации государственной идеологической политики через систему лекционных форм работы.

**Т.АВДОНИНА,**
**доцент кафедры довузовской подготовки и профориентации.**

## *Факультэту замежных моў – 5 гадоў*

# "НАПЕРАД, ДА НОВЫХ ВЯРШЫНЬ!"

*В День юбилея славный*
*(пускай нам только пять)*
*так много слов о главном*
*случилось услыхать!*

*Родители, коллеги,*
*Выпускники всех лет*
*Сердечно поздравляли*
*Любимый факультет.*

*Спасибо всем студентам!*
*Признательность – друзьям,*
*мы любим вас и ценим*
*и очень верим вам!*

**От имени ин.язовцев.**
**Е.САДОВСКАЯ,**
**зам. декана**
**по воспитательной работе.**

*Па-сапраўднаму цікавай, захапляльнай і памятнай стала праграма мерапрыемстваў да першага юбілею ў жыцці факультэта замежных моў. Ініцыятыву, энтузіязм, актыўнасць і знаходлівасць праявілі спаўна арганізатары і ўдзельнікі святочных дзён – куратары, старасты, культоргі груп, выкладчыкі і студэнты. Прыўзняты настрой панаваў паўсюдна: у кабінетах, аўдыторыях, калідорах, аформленых, упрыгожаных разнастайнымі плакатамі і малюнкамі, насценнымі газетамі…*

*Было ў чым паспрабаваць, праявіць свае сілы і здольнасці студэнтам. Алімпіяда па граматыцы англійскай мовы, якая праводзілася сярод першакурснікаў, вызначыла мацнейшых: перамагла Наталля Гуськова (гр. А-11), на другім і трэцім месцах – Крысціна Ізыгзон і Ірына Пазнякова (гр. А-12). На конкурс на лепшую эмблему факультэта прадставілі свае праекты 13 студэнтаў. Лепшым прызналі варыянт Алены Верамеевай (гр. А-33). Конкурс "Здагадайся, хто гэта?", ток-шоу "Нам сёння роўна 5", гульня "Вось і зразумей мяне" і іншыя мерапрыемствы збіралі шмат удзельнікаў і балельшчыкаў, дапамагалі лепш даведацца студэнтам аб выкладчыках і наадварот.*

*Спонсарам юбілейных урачыстасцей з'яўляўся прафкам студэнтаў універсітэта, з дапамогай якога пераможцы заахвочваліся салодкімі прызамі. А кульмінацыяй святочных дзён стаў конкурс "Міс факультэта".*

Замежнікі, як заўсёды, былі вельмі арыгінальнымі. Студэнты па ўласнай ініцыятыве арганізавалі свята ў выглядзе шоу-праграмы, конкурсу "Міс факультэта-2003".

...Актавая зала – у чаканні цікавага шоу. Адкрываецца заслона. На сцэне з'яўляецца дэкан факультэта замежных моў дацэнт Л.С. Баннікава, якая вітае выпускнікоў, цяперашніх студэнтаў, выкладчыкаў і гасцей. Людміла Сцяпанаўна расказвае пра заслугі студэнтаў-замежнікаў. За пяць гадоў існавання факультэта ўжо з'явіліся свае традыцыі, ёсць добрыя вынікі ў паспяховасці, спорце і г.д. Сваё выступленне Людміла Сцяпанаўна завяршыла словамі: "Наперад, да новых вяршынь!!!"

Пасля была паказана невялікая канцэртная праграма, складзеная з нумароў конкурсу "Ану, першакурснік!" Бліскуча выступілі ўжо ўсім добра вядомыя "бабы-мужыкі" – Юля, Насця, Каця. Дзяўчаты даволі ўпэўнена трымаліся на сцэне.

І вось надыходзіць самы цікавы і хвалюючы момант шоу – знаёмства з прэтэндэнткамі на званне "Міс факультэта": **Ірына Карасёва** – вучыцца на першым курсе, грае на гітары; **Надзея Шаўчэнка** – трэцякурсніца, любіць весялосць, добра праводзіць час у кампаніі сяброў; **Вольга Глушэц** – азартная, любіць добрую музыку, марыць прафесійна займацца фота- або журналістыкай; **Ірына Кувардзіна** – захапляецца вывучэннем замежных моў, асабліва італьянскай, лёгка знаходзіць агульную мову ў зносінах, любіць шчырых, добразычлівых людзей; **Юлія Абрамовіч** – трэцякурсніца, лічыць за шчасце знаходзіцца побач з блізкімі людзьмі; **Алена Шуляк** – першакурсніца, любіць увагу, раўнадушна ставіцца да крытыкі, баіцца сцэны і таму вырашыла прымаць удзел у конкурсе; **Марыя Азбель** – Цялец па гараскопу, "і лёд, і полымя", любіць праводзіць час з сябрамі.

У вершаванай форме, радкамі паэтаў-класікаў прадставілі сябе ў першым конкурсе факультэцкія прыгажуні. А наперадзе – яшчэ два асноўных конкурсы: дамашняе заданне і паказ вячэрніх убрання.

Гледачам вельмі спадабалася тэма "дамашняга задання": "Новы год у розных краінах свету". Зала захаплялася тым, як дзяўчаты вельмі цікава і проста змаглі не толькі паведаміць, але і паказаць, як святкуюць Новы год у розных краінах свету. Больш арыгінальнымі аказаліся ўдзельніцы пад нумарамі 1 і 6 І. Карасёва і А. Шуляк. Ірына паведаміла гледачам пра цікавы кастынг Дзеда Мароза, а Алена расказала і прадэманстравала, якое вялікае значэнне мае сустрэча Новага года для ўдзельнікаў перадачы "Апошні герой".

У прамежках паміж конкурсамі выступалі студэнты чацвёртага курса і народны ансамбль сучаснага танца "Віда", Яўгенія Давыдава і рабяты-з акустычным нумарам "Сакрамэнта". Гучала жывая музыка, удзельніцы спявалі песні на англійскай мове.

У апошнім конкурсе былі прадстаўлены ўбранні салона вячэрніх касцюмаў Алены Шылец. Дзяўчаты выдатна сябе адчувалі ў іх, змаглі з годнасцю прайсціся па подыуме з усмешкай на твары. Асабліва гэта добра атрымалася ва ўдзельніцы пад нумарам 4 Ірыны Кувардзінай. Таксама дзяўчаты паказалі калекцыю джынсавага адзення ад магазіна "Big star".

Пасля заканчэння апошняга конкурсу ўсе члены журы прайшлі за сцэну для абмеркавання. Настаў самы адказны момант свята і таму, каб зняць напружанне гледачоў, на сцэне з'явіліся рабяты са СТЭМа. Зале, як заўжды, сумаваць не давялося.

І вось аб'явілі доўгачаканыя вынікі шоу: у намінацыі "Міс-сімпатый гледачоў" перамагла ўдзельніца пад нумарам 4 Ірына Кувардзіна. "Міс-артыстызм" выбралі ўдзельніцу пад нумарам 5 Марыю Абрамовіч. "Міс-індывідуальнасць" аказалася Марыя Азбель, удзельніца пад нумарам 7. У намінацыі "Міс-чароўнасць" узяла верх удзельніца пад нумарам 2 Надзея Шаўчэнка. Тры галоўныя месцы дасталіся ўдзельніцам пад нумарамі 1, 3 і 6. Першай Віцэ-міс аказалася **Ірына Карасёва** (№1), другой Віцэ-міс прызналі **Вольгу Глушэц** (№3). Ну, а галоўны прыз (магчымасць у далейшым займацца ў агенцтве "Грацыя") дастаўся ўдзельніцы пад нумарам 6, **Алене Шуляк.** Менавіта яна, на думку журы і дырэктара агенцтва, прызнана "Міс-Грацыя-2003" і "Міс факультэта замежных моў-2003". Удзельніцам конкурсу дасталіся салодкія прызы ад кандытырскай фабрыкі "Спартак", цёплыя апладысменты і любоў гледачоў.

Акрамя сямі намінантак у мерапрыемстве прынялі ўдзел Наталля Баброва, Тамара Лубачкіна, Яўгенія Шэвель, Ганна Гатальская і іншыя. Яны выказваюць шчырую падзяку студэнтцы чацвертага курса Алене Кісель, культоргам факультэта Святлане і Але і ўсім тым, хто прымаў удзел у падрыхтоўцы шоу-праграмы.

**К. КУШНЯРОВА,**
**студэнтка гр. БФ-12 філфака.**



**На здымку (злева направа): другая Віцэ-міс В. Глушэц, «Міс факультэта» А. Шуляк і першая Віцэ-міс І. Карасёва.**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

**П**о праву можно назвать наш Гомель городом студентов. В нем – 7 высших учебных заведений, которые готовят высококвалифицированных специалистов по самым различным профилям: педагогов, инженеров, медиков, экономистов, юристов… Каждый вуз – это своеобразная отдельная «планета» со своей историей, традициями. Но есть между ними и то, что объединяет всех, кто пришел в студенческие аудитории за знаниями, будь то технарь или гуманитарий. Это энергия молодости, жажда познания, открытий, проверки своих талантов и способностей. Для этого в каждом высшем учебном заведении созданы соответствующие условия.

Годы учебы могут стать для каждого студента еще более интересными и памятными, если не «замыкаться» только в стенах родной Alma mater. Сегодня мы хотим познакомить вас с Гомельским медицинским университетом.

***Уже в 2000 г., по данным Министерства образования Республики Беларусь, опубликованным в журнале «Вышэйшая школа», по итогам вступительных экзаменов рейтинг ГоГМУ среди всех ВУЗов республики Беларусь поднялся до 16 из 43 государственных ВУЗов, что на 5 пунктов выше по сравнению с Витебским и на 6 – с Гродненским медицинскими университетами.***

# ДАВАЙТЕ ЗНАКОМИТЬСЯ И ДРУЖИТЬ!



Гомельский государственный медицинский институт был основан 1 ноября 1990 года. Прежде всего, была поставлена цель — улучшить обеспечение врачебными кадрами лечебно-профилактические учреждения, повысить уровень и качество медицинской помощи населению районов, пострадавших от аварии на ЧАЭС. Надо сказать, что Гомельская область постоянно испытывала нехватку личных кадров. Местные власти впервые обратились в правительство республики с просьбой об открытии медицинского института еще в 1958 году. Но тогда предпочтение было отдано Гродно.

В ноябре 1990 года в Гомель приехали первые сотрудники нового медицинского института. Именно с них и началась история нашего университета. Сначала не было ничего, кроме инициативных людей, желающих работать. Уже с 1 декабря 1990 года организовали работу подготовительного отделения: было набрано 120 абитуриентов. На первый курс приняли около 300 человек. Причем конкурс был самым высоким среди медицинских ВУЗов республики – 5 человек на место.

Встал вопрос о месте размещения института. На последнем в августе 1991 года заседании бюро Гомельского обкома партии было принято решение о передаче нашему институту здания обкома по улице Ланге, 5. А в «демократическом» в то время горисполкоме никто не был заинтересован в этом "неперспективном" проекте. В октябре 1991г. горисполкомом было выдвинуто предложение о сдаче здания обкома в аренду коммерческим организациям, а валютные поступления использовать на нужды города, в том числе и на развитие медицинской отрасли (последнее, вероятно, в качестве утешительного приза). В итоге облисполком вынес окончательное решение о передаче корпуса по улице Ланге институту. Этому способствовали активные действия студентов и преподавателей ВУЗа.

Сейчас Гомельский государственный медицинский университет – это 199 человек профессорско-преподавательского состава, 31 кафедра, в том числе 16 клинических, центральная научно-исследовательская лаборатория, 18 крупных клиник, оснащенных современным оборудованием, на базе которых производится обучение, библиотека с богатым книжным фондом, 3 читальных зала с возможностью полноценной подготовки к учебному процессу, компьютерные классы с выходом в Internet, лингофонные классы. Свыше 1800 (в том числе более 100 иностранных) студентов, обучаются на четырех факультетах института: медико-диагностическом, медико-профилактическом, лечебном, факультете довузовской подготовки.

Университет известен за рубежом как центр высшего медицинского образования и медицинской науки в Чернобыльском регионе, получил международное признание, поддерживает и развивает разносторонние контакты с медицинскими вузами ближнего и дальнего зарубежья. Установлены связи с медицинским факультетом университета Нагасаки и университетом Сензю г.Мацумото (Япония), институтом педиатрии Ягелонского университета (г. Краков, Польша), научным обществом молодых ученых и студентов Гданьского университета (Польша), клиникой детского диабета г. Флоренции (Италия), военно-реабилитационным центром г. Рогама (Шри-Ланка), медицинским факультетом университета г. Абердина (Шотландия), тремя университетами США и др. Поддерживаются добрые отношения со многими медицинскими ВУЗами и НИИ России.

**Оксана БЕЛЯЕВА,**
**Диана ШАЙН.**

**Экспрэс-апытанне**

# ЯК ЖЫВЕШ, СТУДЭНТ?

**Апошнім часам на кожным кроку чуеш размовы, якія псуюць настрой, прымушаюць задумацца аб сэнсе існавання і нават «даруюць» стрэс. Ідзеш сабе потым і думаеш: што рабіць на гэтым свеце і навошта ўвогуле жыць, калі навокал людзі такія нешчаслівыя?**

І вырашыла я даказаць, што яшчэ не ўсё страчана. Тым больш, ёсць для такога даследавання добрая падстава: надышоў Новы 2004-ы год, і можна запытацца, чым запомніўся мінулы, 2003-ці. Дарэчы, "ахвярамі палявання" быў выбраны, як прынята казаць, сацыяльна неабаронены пласт — студэнцтва. Не паверыце, але ўсе студэнты, што ўдзельнічалі ў маім навагоднім экспрэс-апытанні, аказаліся шчаслівымі! Кожнаму з іх у мінулым годзе ў нечым пашанцавала.

**Света, філфак:**

– Мінулы год я буду памятаць усё жыццё: мне, як ужо шмат год запар, прыйшоў гасцявы выклік з Бельгіі. І я з сябрамі-бельгійцамі пабывала ў Парыжы. Гэта проста казка!

**Ірына, матфак:**

– У мяне і майго сябра з'явіліся мабільныя тэлефоны. Мы вучымся ў розных гарадах і жывем у інтэрнатах. Сустракаемся раз у 3-4 тыдні, а то і радзей. Гэта вельмі цяжка, бо мы разам ўжо амаль 5 гадоў. А зараз я шчаслівая — магу размаўляць з любым кожны дзень.

**Алена, філфак:**

– Можа, гэта цябе здзівіць, але я люблю заводзіць новыя знаёмствы з геямі, сябраваць з імі. Яны цікавыя, неардынарныя людзі. А 2003-ці год быў насычаны такімі сустрэчамі, я пабывала ў мінскіх клубах, дзе гэтыя людзі адпачываюць.

**Каця, эканамічны факультэт:**

– Я сустрэла вельмі добрага Мішу (ад каментарыя субяседніца адмовілася).

**Сяргей, юрфак:**

– Я даўно марыў мець камп'ютэр. У лістападзе, на дзень майго нараджэння, бацькі мне яго падаравалі. Гэта быў вялікі сюрпрыз! Я за яго вельмі-вельмі ўдзячны.

**Наталля, эканамічны факультэт:**

– У мінулым годзе адбылася самая значная падзея ў маім жыцці: у мяне нарадзілася дачка, якую я вельмі люблю.

***Пасля такіх адказаў так прыемна становіцца на душы і хочацца верыць, што ўсё будзе добра!***

***Дарэчы, 2003-ці год я таксама запомню як шчаслівы, бо ўжо 4 месяцы замужам за самым лепшым чалавекам у свеце!***

**Марына ДЖАЛАЯ.**

# Классный час

## (отчётный рассказ студентки-практикантки о внеклассном мероприятии)

Пройдя студенческую жизнь до VI курса, я оказалась на практике в Гомельской Ирининской гимназии. Вверенный моим педагогическим амбициям 5 «Б» встретил меня двадцатитрехкратным «Здравствуйте!» и яростной иллюзией хаоса и беспредела. Тем не менее объявление о приходе гостей на классный час было встречено с благосклонным вниманием и милостивым позволением – теплым словом «хорошо!».

И вот классный час пробил. Члены Белорусского литературного союза «Полоцкая ветвь» Эмма Прибыльская и Ольга Равченко переступили порог класса – и ожила поэзия. Зачарованные ритмом и мелодией стиха Эммы Прибыльской, пятиклассники наслаждались необычным звучанием-журчанием «Песни»:

**Чувствительный тростник...**
**Дыхание Эола**
**колеблет акварель –**
**речную тишь да гладь...**
**и кто бы ни приник**
**к хрустящей трубке полой –**
**печальная свирель**
**слезою обожгла!..**
**А песня – чья – звучит**
**из дудки тростниковой?!**
**Умел ли пастушок**
**иль это – Божий глас?!**
**Но взор его – лучист!**
**Водою родниковой**
**и чистой – на лужок**
**мелодия лилась!!!**

Автор этих строк родилась в Карелии, где ее с раннего детства окружала атмосфера сказок и легенд Севера, а герои карело-финского эпоса «Калевала» жили рядом с детьми.

**... Гладок – платок и зеркальная –**
**лента...**
**Льется – водица – былина –**
**легенда... (...)**
**Сказка за сказкой – как реченька**
**в русле...**
**Я выпеваю салазки и гусли,**
**а выпеваются – звезды и луны...**
**И упиваются – мифом и**
**руной... (...)**
**Чисты ключи, а колодец –**
**кудесник:**
**за словом – слово, и песня –**
**за песней...**

Ольга Равченко – поэт иного склада. Ее стихи, сложные для восприятия пятиклассников, требовали пояснений, и поэт, преподаватель и переводчик искусно вплетала в свое выступление элементы беседы: «Что человек ни делает – все для себя: рано или поздно нас настигает творимые нами добро и зло».

Отвечая на вопрос школьников: «С какого возраста Вы пишете стихи?», Ольга Равченко процитировала Андрея Вознесенского: «Можно и не быть поэтом, но я чувствую, пойми, как кричит полоска света, прищемлённая дверьми». Затем она напомнила значение слова «поэт» – «Творец», подводя ребят к выводу, что каждый человек изначально Поэт и Творец:

**Повелевая небесами,**
**испытываю арт и шок:**
**вращая солнце-артишок,**
**космическими обхожусь часами.**

Серьезные философские темы стали доступны и близки пятиклассникам благодаря педагогическому и поэтическому таланту Ольги Равченко. Это отметил присутствовавший на встрече руководитель практики, ассистент кафедры педагогики А.Э.Потросов.

Дети охотно шли на контакт, делились сокровенным – стихами собственного сочинения, задавали самые неожиданные вопросы и брали автографы.

«Это был самый классный классный час!» – поделился со мною впечатлениями один из пятиклассников.

**Татьяна ДОРОШКО,**
**студентка VI курса заочного факультета специальности «Русский язык и литература».**

Советы чародеев

# Сдаем экзамены...



***Первоисточник должен быть ближе к голове.***

Масса примет бытует среди студентов, которые способствуют удачной сдаче экзаменационной сессии. Одни подкладывают пятаки под голые пятки, другие студенческому домовому водочку на шкаф ставят, третьи билет левой рукой тянут, сплевывая при этом через левое плечо. Но есть «рецепт» лучше.

Наши предки верили, что острые предметы отпугивают нечистую силу. Можно попробовать «отпугнуть» и агрессивное настроение преподавателя, для чего по углам аудитории, где проходит экзамен, раскладывают по вилке.

У вилки может быть и другое применение. Если сломать ее над головой человека, боящегося отвечать, то он на какое-то время сможет забыть все свои страхи. Пластмассовая вилка подойдет для этих целей лучше всего.



***И ума-разума наберусь, и согреюсь.***

***Фото В.ЧИСТИКА.***

## Ваш досуг

## Смотрите в кинотеатре «Юбилейный»:

**14-18 января:** комедия **«Небесные бандиты»** (США). Начало – 17.00.

Эротическая мелодрама **«Дикая орхидея»** (США). Начало – 19.00.

Цена билета: 1000 руб.

**21-25 января:** комедия **«Брюс всемогущий»** (США). Начало – 17.00. Цена билета: 1000 руб.

Мелодрама **«Семьянин»** (США). Начало – 19.00. Цена билета: 1500 руб.

**28 января – 1 февраля:** триллер **«Слишком красивые, чтобы жить»** (Италия). Начало – 17.00., 19.00. Цена билета: 1000 руб.

**Киносеансы для детей**

**17-18 января:** приключения **«Синдбад: легенда семи морей»** (США). Начало – 14:00.

**24-25 января:** мультсборник **«Осторожно, обезьянки»** (Союзмультфильм). Начало – 14.00.

**31 января – 1 февраля:** сказка **«Гринч, похититель рождества»** (США). Начало – 14.00.

Цена билета: для детей – 300 руб., для взрослых – 600 руб.

Каждую субботу — **молодежная дискотека.** Начало – 19.30.

**Автоответчик: 57-56-69.**

Возьмите на заметку

# 7 энергичных шагов

**У каждого из нас есть такие знакомые: люди, которые носятся весь день как заведенные, которые практически никогда не устают и способны переделать море работы. И при этом не жалуются на свою тяжелую жизнь, а выглядят как если бы они только что приехали с отпуска. В чем секрет их жизненного тонуса? Может быть, им просто повезло и высоким уровнем энергетики их наделила сама природа? Конечно. Может быть, они ведут здоровый образ жизни? Наверняка. Но не только это. Такие люди смотрят на жизнь вполне определенным образом. Может быть, они интуитивно чувствуют правила, по которым существует жизненная энергия, и живут соответственно им.**

Зачем нужен высокий уровень энергии? От нашего тонуса и того, как мы чувствуем себя, зависит и то, как нас воспринимают окружающие люди. Они могут и не осознавать этого, но часто их симпатии и их впечатления о нас зависят от нашего жизненного тонуса.

И, наконец, обладать высоким уровнем энергии – значит ощущать радость и другие позитивные эмоции. Ведь активно действовать, испытывая воодушевление и энтузиазм, намного приятнее, чем едва ползать оттого, что нет сил, что «все надоело». Как повысить уровень жизненной энергии?

**Шаг 1. Поймите, чего вы хотите.**

А, собственно, для чего вам нужна внутренняя энергия, что вы хотели бы сделать с ее помощью, чего добиться? Вопрос не праздный – ведь часть энергии появляется словно ниоткуда, тогда, когда она нужна. Именно поэтому люди с высоким жизненным тонусом – это, как правило, люди, которые знают, чего они хотят. А бесцельное скольжение по жизни рассеивает наши силы, пока мы вдруг не замечаем, что они уже на исходе.

**Шаг 2. Перестаньте экономить.**

«Сегодня я полежу, отдохну, сэкономлю силы, а завтра активно возьмусь за дело», – думаете вы, пытаясь отодвинуть подальше решение проблем. А получается почему-то наоборот – сил становится не больше, а даже меньше. Дело в том, что жизненная энергия появляется тогда, когда она необходима. И не стоит экономить ее, как если бы это был бензин – надеясь, что от этого ее станет больше. Лучше думайте о ней как о мышцах, чья мощь возрастает пропорционально тренировке. И если вы сегодня соберетесь с силами и сделаете то, что требует полной отдачи, – завтра это станет естественным и даже легким.

**Шаг 3. Преодолевайте границы.**

Попробуйте сделать то, что раньше казалось вам невозможным. Честно спросите себя, что вас настолько мучает, что вы не будете это делать ни за какие коврижки? А потом возьмите, да и сделайте это.

**Шаг 4. Делайте то, что любите.**

К сожалению, в суете современной жизни мы не часто находим время на то, что нам действительно нравится. И чаще занимаемся тем, что сделать необходимо. Однако то, что вы любите – будь то рисование или прогулки на природе, или разведение цветов, – придает вам жизненные силы, чтобы переделать все остальное. Понаблюдайте за собой – после какой работы вы чувствуете себя полными сил и энергии, а какое оставляет вас выжатыми как лимон? Постарайтесь изменить свой распорядок, сделав акцент на том, что заряжает вас силами.

**Шаг 5. Обновляйтесь.**

Необычные прогулки, любые нарушения привычных шаблонов и стереотипов значительно повышают энергетический уровень. Попробуйте регулярно делать что-то новое для себя. Не обязательно менять страну проживания или прыгать с парашютом – можно просто купить непривычных продуктов или поменять прическу. Не реже, чем раз в неделю, нужно спрашивать себя: «В чем я изменился за это время? Чему новому научился?».

**Шаг 6. Вспомните нужное состояние.**

Если вам нужно быстро прийти в себя и набраться сил, поможет следующая техника. Вспомните конкретную ситуацию, когда вы были «на высоте» и сил у вас было предостаточно. Представьте прямо перед собой картинку этой ситуации, саму себя, людей и вещи, которые вас окружали. Четко представьте выражение собственного лица. А потом мысленно или физически «шагните» в эту картинку и прочувствуйте это состояние изнутри.

**Шаг 7. Пересмотрите круг общения.**

Общаясь с другими людьми, мы неизбежно перехватываем их внутреннее состояние, заражаясь вирусом успеха или неудачи. Точно так же мы «заряжаемся» от активных людей, обладающих высоким уровнем энергии, и теряем силы, если общаемся с пассивными, обессиленными, с теми, кто постоянно жалуется.

**Н. ЕРЕМЕЕВА.**

## Пестрая смесь

## Шпаргалка

Шпаргалка означает... "лохмотья", "пеленка". В польском языке так называли измаранный, негодный клочок бумаги. Это потом уже появился у нас и другой, известный смысл.

•••

Не могу стоять, когда другие работают, пойду полежу.

•••

Ударим крепким сном по мукам совести.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:**

– усеагульнай гісторыі – дацэнта;
– беларускай мовы – дацэнта;
– рускай літаратуры – дацэнта;
– алгебры і геаметрыі – дацэнта;
– вышэйшай матэматыкі – дацэнта, прафесара;
– агульнай фізікі – старшага выкладчыка;
– экалогіі – загадчыка кафедры;
– заалогіі і аховы прыроды – асістэнта.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, калектыў універсітэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці былых работнікаў нашай ВНУ – прарэктара па завочнаму навучанню **БАЛТОЎСКАГА Альберта Іванавіча**, дацэнта кафедры філасофіі **ПРОЦКАЙ Дзіяны Георгіеўны,** дацэнта кафедры батанікі і фізіялогіі раслін **ХІЛЬКЕВІЧА Васіля Аляксандравіча** і выказваюць спачуванні іх родным і блізкім.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта фізічнай культуры, калектыў кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку названай кафедры **ЧОБАТАВАЙ Зінаідзе Іванаўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **МАЦІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры палітычнай сацыялогіі выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку названай кафедры **ЦІШКЕВІЧУ Міхаілу Якаўлевічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры філасофіі выказваюць глыбокае спачуванне старшаму выкладчыку названай кафедры **ЗАШЧУК Людміле Васільеўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **БРАТА**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат факультэта псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі, калектыў кафедры псіхалогіі выказваюць глыбокае спачуванне лабаранту названай кафедры **КУРАЧЭНКА Святлане Васільеўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – заўчаснай смерці **ДАЧКІ АКСАНЫ**.

Дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку раптоўнай смерці студэнткі гр. М-43 **КУРАЧЭНКА Аксаны** і выказваюць спачуванне яе родным і блізкім.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4009
Падпісана да друку 12.01.2004 г.